# Змаганне з кузуркамі

Прайшло колькі дзён, і Юзіку надакучыла думаць. Ён вырашыў дзейнічаць.

Добра, мама з татам яму не вераць... Але на свеце так шмат дарослых, пэўна ж, хтосьці з іх дапаможа!

І вось, калі бацькі былі занятыя ўласнымі справамі, Юзік патэлефанаваў у Даведку — нумар быў запісаны вялікімі лічбамі ў тэлефоннай кнізе. Здавалася, што Даведка — месца, дзе можна даведацца пра ўсё на свеце.



— Толькі не пужайцеся, — прашаптаў хлопчык. — Яно значна большае за прусака. Мне здаецца, што яно памерам... як цмок!

Але дзядзечка ўсё роўна спужаўся.

— Цмок? — перапытаў ён. — Мы цмокамі не займаемся. У нас няма такога абсталявання. Нам нават мазь ад апёкаў не выдаюць. Тэлефануйце ў пажарную частку!

І кінуў трубку.

Юзік-Гузік паслухмяна набраў нумар пажарнай службы. Але там не захацелі размаўляць — як толькі пачулі пра цмока, адразу абазвалі хлопчыка хуліганам і паабяцалі паведаміць бацькам.

Больш Юзік не адважыўся нікому тэлефанаваць.



Юзік-Гузік патлумачыў, што ў мамы на галаве былі не змеі, а папільёткі, на якія накручваюць валасы. А тата проста ступіў нагою ў вазон для кветак.



— Усё адно не вылезу, — сказаў голас.

— Добра, — не стаў спрачацца Юзік. — Заўтра мама з татам пойдуць на працу. Са мной будзе сядзець суседка. Яна старэнькая і сівая, яе можна не баяцца.

На тым і дамовіліся.

Калі ўвечары мама зайшла пажадаць Юзіку добрай ночы, яна не заўважыла мыльных бурбалак. А яны ж разляцеліся па ўсім пакоі:




— самых розных колераў і адценняў. І калі якая бурбалка залятала пад ложак, яе выганяў адтуль доўгі, пакрыты лускою хвост.